**Увага! Конкурс!**

**Зацвярджаю:**
дэкан філалагічнага факультэта
Ісмайлава Л.В.
“20” лютага 2015 года

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб правядзенні рэгіянальнага літаратурнага конкурса “Я перад Вамі з памяццю сваёй…”, прысвечанага 70-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне**

**1. Мэты і задачы конкурса**

– фарміраванне грамадзянска-патрыятычнай свядомасці школьнікаў і студэнтаў;

– вывучэнне тэмы вайны ў айчыннай літаратурнай традыцыі;

– актуалізацыя мастацка-творчай дзейнасці навучэнцаў і студэнтаў;

– пошук таленавітай моладзі, якая цікавіцца гісторыяй і культурай беларускага народа.

**2. Літаратурны конкурс праводзіцца па намінацыях:**

– “Малая проза”
– “Паэзія”
– “Публіцыстыка. Літаратурная крытыка”
– “Успаміны. Інтэрв’ю. Эсэ”.

**3. Заснавальнікі конкурса:**

– кафедра літаратуры УА МДПУ імя І.П. Шамякіна;
– аддзел па выхаваўчай рабоце з моладдзю;
– прафкам студэнтаў УА МДПУ імя І.П. Шамякіна;
– Мазырская раённая арганізацыя ГА БРСМ.

**4. Тэрміны правядзення:**

З 20.02.2015 па 30.04.2015.

**5. Удзельнікі конкурса:**

У конкурсе прымаюць удзел навучэнцы ўстаноў адукацыі палескага рэгіёна, студэнты УА МДПУ імя І.П. Шамякіна.

**6. Умовы правядзення конкурса:**

Удзельнікі конкурса рыхтуюць аўтарскія творчыя работы (літаратурныя творы, эсэ, успаміны), у якіх адлюстроўваецца іх асабістае ўспрыняцце трагедыі і подзвіга беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

**7. Афармленне работ:**

Фармат Word: тып файла rtf, шрыфт Times New Roman

Памер шрыфта – 14.

Творы павінны быць надрукаваны на адной старонцы ліста фармата А4.

Агульны аб’ём прапанаваных работ не павінен быць большым за 3 друкаваныя лісты.

Конкурсныя работы дасылаюцца з 20.02.2015 па 30.04.2015 (з паметкай “На конкурс”) на электронны адрас bellitmzr@mail.ru і на паштовы адрас: 247760 Гомельская вобласць г. Мазыр, вул. Студэнцкая, 28, УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, кафедра літаратуры.

Конкурсныя работы могуць утрымліваць фота-, відэа- і аўдыёматэрыялы.

Мовы конкурсных работ: беларуская, руская.

**Падвядзенне вынікаў конкурса і фінансаванне.**

Пераможцы літаратурнага конкурса вызначаюцца ў кожнай намінацыі. Удзельнікі конкурса, якія занялі 1-3 месцы, узнагароджваюцца дыпломамі і прызамі прафкама студэнтаў УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, ГА БРСМ.

Лепшыя работы будуць апублікаваны на старонках сайта УА МДПУ імя І.П. Шамякіна.